**ЛЕАНІД МАРАКОЎ**

# 100 МІНІЯЦЮР

**Мінск**
2002

## Частка першая

# РОД



# ВЯЛІКАМОРСКАЯ ВУЛІЦА

Лёнік ішоў з бацькам па вуліцы і ціхенька, сам сабе, радаваўся. Бадай, недарэчна так вось проста ўсміхацца, але шчасце, гонар і нейкае новае, упершыню зведанае пачуццё перапаўнялі яго.

Суседзі глядзелі на іх не зводзячы вачэй. А Лёнік з таткам ганарліва міналі адны веснічкі, другія, трэція. Ён ужо вялікі — татку ажно па плячо! Ён усё і ўсіх разумее. Толькі не гэтых, што, быццам па камандзе, пасталі ля весніц і кланяюцца ім:

— Дабрыдзень, дабрыдзень, са шчаслівым вяртаннем!..

— Нарэшце маці прычакала!..

— І сынок, гляньце, як вырас!..

— А вы, Уладзімір Змітравіч, проста малайчына!..

— Добры дзень, — чулася ў адказ.

“Татка, вядома ж, малайчына, а вы? — думаў рана пасталелы Лёнік. — Дзе былі вы, калі цкавалі татку? Калі білі татку? Калі забіралі татку? Дзе былі вы, калі арыштоўвалі дзеда, які паставіў на гэтай вуліцы першы дом, гукнуў з Далёкага Усходу сваіх аднапалчанаў, вашых дзядоў? Чаму яны

грудзьмі стаялі адзін за аднаго, змагаючыся з японскімі самураямі, а вы — спалохаліся нейкага чорнага варанка? Чаму не перакулілі яго, не спалілі, не прагналі прэч начных шакалаў, што прыехалі па бацьку? Чаму, як пацукі, зашыліся ў норы і, калоцячыся, стаіўшы дыханне, чакалі пакуль не здох галоўны шакал? Што бачылі вы ў сваім пацучыным жыцці? А татка бачыў Пекла! Ён яго ўжо бачыў, а ў вас яшчэ ўсё наперадзе...».

— Дабрыдзень, дабрыдзень, са шчаслівым вяртаннейкам...

Лёнік з таткам праходзілі паўз чарговыя весніцы...

✧✧✧

# РАЗ-ДВА...

Памяць, як і гены, не ашукаеш.

Піянерскі лагер.

Лета, ранак, сонца, СССР.

Мама. Слёзы развітання. Пакуначак з ежай, заплечнік з рэчамі. Наказ: слухацца выхавальнікаў, ні кроку з лагера, у ціхую гадзіну спаць, усё есці, дыхаць свежым паветрам.

Аўтобус. Дарога. Песня: "Как хорошо в стране советской жить...". Весела. Знаёмства. Прыезд.

Рассяленне. Каманда: па вагонах (палатках, доміках)! Выдзяленне ложка-месца. Знаёмства з распарадкам, з тэрыторыяй. Не заходзіць за сцяжкі.

Збор. Першая пераклічка-лінейка. Трыбуна. Старшая піянерважатая. Заклік: наперад, да перамогі камунізму! Гімн: "За детство счастливое наше спасибо, родная страна". Хорам.

Абед.

У сталоўку — шагам марш! Запявай!

*Кто шагает дружно в ряд?*
*Раз-два, раз-два!*
*Пионерский наш отряд!*
*Раз-два, раз-два!*

На памяць. Паўтарыць. Тройчы.

Прыйшлі. Ямо.

Са сталоўкі — шагам марш! Запявай!

*Кто шагает дружно в ногу?*
*Раз-два, раз-два!*
*Уступите нам дорогу!*
*Раз-два, раз-два!*

На памяць. Паўтарыць. Тройчы.

Па вагонах: адбой, ціхі час, шэпт, жарты, анекдоты, планы.

Пад'ём. Падвячорак-кефір. Туалет. Бягом. Паспеў.

Фізрук. Спаборніцтвы: лёгкая атлетыка, "Зарніца", паход, касцёр. У здаровым целе — здаровы дух.

Ганаровыя граматы пераможцам.

Купанне — шчасце.

Вячэра. Нарэшце!

Зноў пераклічка-лінейка. Трыбуна. Старшая піянерважатая. Заклік: наперад, да перамогі камунізму! Гімн: "За детство счастливое наше спасибо, родная страна". Хорам.

Сутонне. Танцы. Дзяўчаткі. Адбой. Не, уцёкі. Начныя гулі. Віно. Першы пацалунак. Трохкутнік. Бойка. Пакаранне.

Піянерскі лагер.

Памяць, як і гены, не ашукаеш.

Лета, ранак, сонца, СССР.

*Раз-два, раз-два...*

# НЕ ТОЕ ЧЫТАЎ...

Здаецца, добра вучыўся, не быў хуліганам, маркі збіраў, фотасправай захапляўся, шайбу на двары да ночы ганяў, вершы прысвячаў дзяўчынкам, процьму ўсяго перачытаў, асабліва фантастыкі, а ў піянеры прымалі адным з апошніх...

Можа, не тое чытаў?

✧✧✧

# ШАНЦ

Ён стаяў на мосце. Злева — царква. У ёй хрысцілі маці, братоў, сына.

Ён ужо даўно ўсё вырашыў. Вынес прысуд сабе. Чым ён, змардаваны калека, можа дапамагчы сыну? Відаць — наадварот: пры жывым бацьку ў яго будуць толькі непрыемнасці. І чым далей, тым часцей сына будуць папікаць бацькам. Не, ён павінен памерці, не замінаць сыну. Тут, дзе прайшло маленства, і скончыцца яго жыццёвая дарога. Ён вызваліць сына ад непасільнага цяжару...

Ён стаяў на мосце. Злева — царква. У ёй хрысцілі маці, братоў, сына.

І ён скочыў...

Выжыць у бацькі шанцаў не было. Не было ў яго сілы, не засталося. Ды ён і не хацеў: яго няма — і праблем няма.

Шанц выжыць быў адно ў мяне, ягонага сына.

✧✧✧

# ПРАЗ ТРЫЦЦАЦЬ ГАДОЎ

**...пасля смерці бацькі сын напіша:**

*“Тата, чаму ты не падумаў пра мяне? Навошта загубіў сябе? Калі б ты ведаў, як усе гэтыя гады мне было цяжка без цябе, без твайго пляча, без твайго добрага слова падтрымкі. Без тваёй любові, клопату, дапамогі. Колькі разоў я адчуваў за спінаю дыханне смерці. Колькі разоў шукаў яе сам. І толькі боязь, што і твой унук калі-небудзь скажа: “Тата, чаму ты не падумаў пра мяне? Навошта загубіў сябе?”, — спыняла мяне...”*

✧✧✧

# ЯКІ Я?

Паводле Ніцшэ, адукаваны чалавек — гэта той, хто кантралюе сябе.

Я адно і рабіў, што кантраляваў сябе: калі вучыўся ў школе, у інстытуце, калі працаваў у АН БССР, займаўся бізнесам у розных кутках свету. Але я не кантралюю сябе, калі адпачываю, радуюся, кахаю.

Які я чалавек?

✧✧✧

# Я НЕНАВІДЖУ!

Я ненавіджу тых, у каго няма нічога святога. Да прыкладу, таго доктара вольных навук, які патрабуе долары за рэдагаванне артыкула, што я напісаў да 90-годдзя расстралянага ў 1937-м дваццацівасьмігадовага беларускага паэта. Трыццаць хвілін сваёй работы ён ацаніў у трыццаць доллараў (мая паўтарамесячная зарплата). Чаму я не патрабую кампенсацыі за месяцы пошукаў у бібліятэках і архівах? Пакуль збіраліся матэрыялы пра расстралянага, пакуль пісаўся артыкул, я ні капейкі не зарабіў на сям'ю, і, каб пракарміцца, давялося прадаваць уласныя рэчы...

***

Я ненавіджу шэрых, ардынарных тхароў, якія ўчэпіста выседжваюць усё сваім азадкам. Большасць з іх — гэта так званыя простыя людзі, народ. Але тады атрымліваецца нешта страшнае: “Я ненавіджу свой народ”?!.

***

Я ненавіджу мужчын (дакладней было б назваць іх асобінамі мужчынскага полу), якія ездзяць на

працу і з працы ў грамадскім транспарце. “Калі ты нават да пятага дзесятка не змог купіць машыну, забі сябе, але не ганьбі высокае імя мужчыны”, — думаў я, стоячы на апошняй прыступцы ранішняга аўтобуса-душагубкі...

✧✧✧

# ДУША І ЦЕЛА

Мне — сорак. Целу — шэсцьдзесят, душы — дваццаць. Чаму гэтак? Адкуль такі разрыў? Чаму цела слабне, саступае адну пазіцыю за другой, а душа адно набірае абароты? Мацнее, захоплівае, перамагае?

Чаму? Чаму? Чаму?

Пытанні...

Я хачу ведаць адказы! Я хачу ведаць! Я патрабую! Маю права! У мяне адно цела, адна душа, адно жыццё!

Вар'ят! Чаго я крычу-гарлапаню? Ашукваюся, спадзяюся, блытаю? Я ж ведаю, чаму гэтак. Ведаю!

Я жыў целам, а душу стараўся берагчы, не напінаць, і яна пачасту спала, адпачывала. А цела — імчала ўразнос, разрывалася на часткі, задыхалася, не ведаючы межаў сваіх магчымасцяў. Целу я здрадзіў, кінуў на волю лёсу, напляваў на яго, і цяпер спажываю плады.

Мне — сорак.

Ёсць душа, але няма цела, спакою, жыцця.

Цела ўзляцела, загінула, знікла.

Знік я.

Мне — сорак. Зараз, заўтра, заўсёды, вечна.

# ХВАЛЯВАННЕ

Часта кажуць: “Не хвалюйцеся, шануйце здароўе”. Лёгка сказаць! А як адолець яго, хваляванне?

Пра гэтую чалавечую слабіну напісана, відаць, болей, чым пра каханне. Колькі яно знявечыла лёсаў, перавярнула жыццяў! Колькіх загнала ў магілу! Знішчыла, загубіла. Нездарма хваляванне — ніякага роду. Яно — жывёліна. Як жывёліна, яно і не выбірае, каго звесці ў магілу, над кім злітавацца. І нікуды ад яго не ўцячэш. Хваляванне ўласцівае чалавеку, разам з ім нараджаецца, жыве і памірае. Яно — частка яго.

І цяпер я хвалююся. За дзяцей, за будучыню, за краіну. Я хвалююся, значыць — жыву, значыць, я — чалавек. Але чалавек слабы. Хваляванне рана ці позна звядзе мяне ў магілу. І няма гэтаму альтэрнатывы. Але не хвалявацца не магу.

Я — чалавек!

✧✧✧

# РЭКЛАМА

*“Лётайце самалётамі Аэрафлоту!”*

Я саджуся ў самалёт, разумеючы, што не маю стопрацэнтнага шанцу вярнуцца на зямлю. Выбраўшы гэты спосаб перамяшчэння, я рызыкую значна болей, чым калі б паехаў, скажам, цягнікам. Але я лячу. Жаданне апынуцца там, дзе трэба, як мага хутчэй прымушае мяне рызыкаваць. І я гуляю са смерцю. Першым разам смерць, дапусцім, прайграла. Але — якою цаной! У яе стала болей на адзін шанц. І з кожным новым палётам рызыка павялічваецца. І калі-небудзь я вычарпаю ліміт. Не абавязкова ў самалёце. Кожны чалавечы крок — ёсць рызыка, рух у цемры, гульня са смерцю. Мы толькі думаем, ́быццам ведаем, што нас чакае, а ўсё — не так. Мы заўсёды рызыкуем, стаім на краі прорвы. Мы не ведаем свайго часу, але калі-небудзь шанц не ўпасці зробіцца роўным нулю. І тады…

*“Лётайце самалётамі Аэрафлоту!”*

✧✧✧

# МЯЖА МАГЧЫМАСЦЯЎ

Мяжы сваіх магчымасцяў не ведае ніхто.

Заканчваюцца трэція суткі за рулём. Адолена чацвёртая тысяча кіламетраў. Без адпачынку. Запраўка ноччу ў дальнабойшчыкаў: паўсюль — шакалы.

Ён змагаўся. Доўга. Але стаміўся, здаўся, заснуў, — загінуў. Застаўся цень. Калі ён адчувае, што знікае, дык азіраецца, бачыць яшчэ два маленькія цені на заднім сядзенні — хлопчыка і дзяўчынкі, і — ажывае. Зноў, у соты раз.

Няма мяжы!

Мяжы сваіх магчымасцяў не ведае ніхто.

✧✧✧

# МАСКВА

Мой дзядзька па матчынай лініі нарадзіўся ў глухой палескай вёсачцы пад Гомелем. З залатым медалём скончыў школу. Пасля — на выдатна! — інстытут народнай гаспадаркі. Далей была праца: загадчык планавага аддзела, намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы. Запрашэнне ў Маскву, Саўмін, выбранне ў ЦК...

Да пенсіі дзядзька Толя не дажыў: з'елі новыя партыйныя сябры-зайздроснікі.

Жонка перажыла яго на год.

А пазнаёміліся яны ў Маскве, у Доме ўрада. Што дзіўна: яна таксама нарадзілася ў Беларусі (недзе каля Оршы) і ўзнялася па вельмі падобнай лесвічцы: з адной чацвёркай скончыла вясковую школу, праз пяць гадоў атрымала ў інстытуце “чырвоны” дыплом, пасля — міністэрства адукацыі і — нечаканае запрашэнне ў Маскву...

Цяпер словы “дорогая моя столица...” з вядомай песні я разумею па-свойму.

✧✧✧

# ПЕРАЙМЕНАВАННЕ

Да двух гадоў я быў Аляксандрам — гэтак хацела назваць і гэтак запісала мяне мама. Але пасля бацька ўсё ж настаяў на сваім, і я зрабіўся Леанідам — у гонар дзядзькі, бацькавага брата.

Я пражыў сорак тры гады і не ведаю, пайшло перайменаванне мне на карысць ці на шкоду, але думка пра гэта і ёсць, мне здаецца, першым крокам у пошуках адказу.

✧✧✧

# ІНКВІЗІЦЫЯ

Я ніколі не дарую *ім* пакутніцкай смерці вялікага Джардана Бруна, як і пагібелі той зніклай у апраметнай часу чарнавокай красуні-вядзьмаркі, якой яны распісяжылі жалезам чуйныя маладыя грудзі, распаленымі абцугамі знявечылі пяшчотныя рукі і гонкія ногі, бізуном пасеклі гнуткую спіну, каб урэшце спаліць на вогнішчы.

Я ніколі не дарую *ім* расстрэлу майго дзядзькі, любімага вучня *Янкі Купалы*, паэта *Валерыя Маракова*. Рана ці позна, у гэтым ці *тым* жыцці, але адшукаю катаў.

Чакайце, гніды! Дрыжыце! І не ўздумайце здохнуць да майго прыходу!

З вогнішчаў пачалі, на іх і скончыце!

✧✧✧

# “І САРАКА ПЯЦІ ГАДОЎ УГА ЯК ХОПІЦЬ...”

У любай маёй бабулі было пяцёра дзяцей: дзве дзяўчынкі і трое хлопчыкаў.

Прыгожыя, як і сама бабуля, дачушкі памерлі ў маленстве ад дызентэрыі.

Сыны...

Старэйшага расстралялі ў дваццаць восем.

Сярэдняга забілі з-за вугла ў спіну ў дваццаць дзевяць.

Малодшы загінуў у сорак чатыры.

У юнацтве, калі я чакаў смерці ў Гомельскім тубдыспансеры, выпадкова пачуў прысуд галоўнага ўрача:

— А пункцыю ўсё ж дарэмна ўзялі, цяпер пасля сарака пяці ён — не жылец...

Між іншым, пісьменнік Міхаіл Велер у сваім аповедзе “Гуру” прыйшоў да высновы, што некаторым “і сарака пяці гадоў уга як хопіць...”.

У мяне засталося блізу двух гадоў. У прынцыпе — гэта нямала.

Галоўнае, каб не арыштавалі, як дзеда ў трыццаць пятым.

Каб не расстралялі, як яго старэйшага сына, майго дзядзьку, паэта Валерыя Маракова ў трыццаць сёмым.

Каб не забілі, як яго сярэдняга сына, майго другога дзядзьку, настаўніка Леаніда Маракова ў сорак трэцім.

Каб не заліла мазгі кроў ад бязлітаснага біцця, як у яго малодшага сына, майго бацькі...

І тады ўсё задуманае я паспею здзейсніць.

Божа, дай мне два гады!

✧✧✧

# СЛАБАСЦЬ

Я — слабы. Створаны з савецкага генетычнага матэрыялу, запалоханы школаю, камунякамі, мянтамі, невядомасцю, лёсам, я — слабы, зусім слабы.

Я — адзін.

Але я — чалавек.

І таму я рызыкую, пішу, вяртаю з цемры гістарычнай несправядлівасці выкрасленыя нелюдзямі імёны.

Чаму чорна-шэры кардынал Пятро Глебка стаіць на ўвесь рост на савецка-прэстыжных Маскоўскіх могілках, а празаік з задаткамі генія Лукаш Калюга расстраляны на ўзлёце і пахаваны ў адной з ямаў-могільнікаў людажэркі Сібіры? Сотні, тысячы безыменных магіл! А між тым на праспекце Ф. Скарыны, амаль насупраць колішняй кавярні “Вясна” (так называлася і першае апавяданне Лукаша Калюгі — лёс!), на месцы якой у трыццатыя гады знаходзіўся Дом пісьменнікаў, у жоўта-шэрым

будынку (дзе знішчалі гэтых пісьменнікаў — зноў лёс!) служаць людзі, якім варта паварушыць пальцам — і мы даведаемся, дзе ляжаць класік беларускай літаратуры Максім Гарэцкі, географ Мікалай Азбукін, акадэмікі Язэп Лёсік і Вацлаў Ластоўскі, рэдактар “Нашай нівы” Аляксандр Уласаў, пачынальнік беларускай літаратурнай крытыкі Адам Бабарэка, краязнавец Мікалай Касяровіч, паэты Уладзімір Хадыка, Сяргей Фамін, Сяргей Дарожны, Мікола Гваздоў, Сяргей Ракіта, Янка Туміловіч, Сяргей Астрэйка, драматург Васіль Шашалевіч, яго брат сатырык Андрэй Шашалевіч (А.Мрый), празаікі Сымон Баранавых і Барыс Мікуліч, мовазнавец Язэп Воўк-Левановіч, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Слуцкага паўстання Павел Жаўрыд, святар і публіцыст Адам Станкевіч, журналісты Радыён Шукевіч-Траццякоў і Сяргей Знаёмы, правазнавец Рыгор Парэчын, доктар і літаратар Павел Каравайчык, сотні іншых бязвінна забітых. Дзе ў Мінску закапалі дваццаць літаратараў расстраляных у “амерыканцы” ўначы з 28 на 29 кастрычніка 1937 года ? Дваццаць за адну ноч! Дзе?

І быў жа шанц даведацца. Яшчэ ўчора. На пачатку 1990-х. Упусцілі. Наплявалі на гісторыю! Увесь час плюём на гісторыю! Не хочам яе ведаць. Не хочам умацоўваць падмурак, на якім стаім. Стаім, не рыпаемся, не варушымся,

маўчым. Стаім у балоце і маўчым. Маўчым і сыходзім у дол. Багна засмоктвае. Паволі, непрыкметна. Усё глыбей і глыбей. Дзесяць мільёнаў. Як тады тых дваццаць літаратараў...

Гісторыя паўтараецца.

✧✧✧

# МОЖА, ЧАС?

Думка шукаць паратунку ў бязмежных прасторах зямлі ўзнікла не адразу. Дзед ведаў, што такое вайна (сербануў руска-японскай), але вось так узяць усё кінуць-рынуць і паехаць, пачаць жыццё спачатку — не рызыкнуў. Рызыкнула бабуля. Закалыхаўшы двухгадовага Лёніка, узяла за руку шасцігадовага Валерку, сказала:

— Змітрок, ведаю, што не скажу разумней за ўсіх, але ж так яно і ёсць: галоўнае — зберагчы дзяцей, яны — наша будучыня...

У той,1915 год з’ехала кожная другая беларуская сям’я. Вярнулася — кожная трэцяя.

Яны вярнуліся праз два гады. На сваё гора. Трапілі ў крывавую малатарню, што глытала чырвоных, белых і іншых, якія прагнулі імі кіраваць, валодаць іхняй зямлёю, карыстацца з іхняй працы. Дзякаваць Богу, выжылі. Надышло зацішша. Але скончылася яно хутка і не сказаць каб нечакана: дзед атрымаў пяць (а выйшла — усе трынаццаць) гадоў катаржных работ; трох ягоных сыноў (самы малодшы, Уладзімір, нарадзіўся якраз у час зацішша) каго раней, а каго пазней, знішчылі. Але не звялі

пад корань — не паспелі: у сям’і малодшага (якраз у хрушчоўскую адлігу, калі людзей ужо не расстрэльвалі) нарадзіўся я. Пасля брэжнеўскі “дар Божы”: танная каўбаса, батоны, гарэлка “Маскоўская” — галоўнае, працуй. Далей — перабудова, рэформы: капай, хапай, дзейнічай. А вылілася ўсё ў цяперашні маразм, беззаконне, загніванне, марудную, спакваля, смерць...

Можа, зноў пара ратавацца ў бязмежных прасторах?

✧✧✧

# ЧУЖОЕ ЖЫЦЦЁ

Шэрасць, шэрасць, шэрасць... Зноў, усюды, паўсюль, скрозь.

Гэтыя людзі пражываюць чужыя жыцці, прысабечылі чужы дабрабыт, узялі ад грамадства нашмат больш, чым заслужылі і чаго вартыя. Таленты гібеюць у жабрацтве, а шэрасць заняла іхнія месцы і шыкуе.

Галоўная задача Масквы адносна Беларусі: прымусіць нас пражыць чужое жыццё. Напоўніцу жыве ёю засланая або прыкормленая шэрасць.

✧✧✧

# ЛАНЦУГОВАЯ РЭАКЦЫЯ

Зладзеі горшыя ад забойцаў. З забойцам усё ясна — гэта паталагічны тып, вылюдак, якога трэба знішчаць.

Злодзей — садыст. Ён адымае ў вас жыццё без болю, часам — па кавалачках. Два гады вы збіралі жонцы на паліто. Недаядалі, эканомілі на электрычнасці — сляпілі вочы, не ездзілі ў адпачынак, не ўспаміналі пра тэатр... А ён украў кашалёк, у якім ляжалі паперкі, што каштавалі два гады вашага жыцця. Жонка зноў сустрэне зіму ў восеньскай куртачцы і на месяц зляжа з запаленнем лёгкіх. Дзеці, прывучаныя займацца з мамаю, адстануць у школе. “Хуткая” забярэ бабулю, якая атрымае інфаркт ад перажыванняў. Вось такая адбудзецца ланцуговая рэакцыя...

І таму я кажу — зладзеі горшыя ад забойцаў.

✧✧✧

# НА АПОШНЯЙ МЯЖЫ

Я ведаю, лічыльнік уключаны, растае мая шчыгрынавая скура. Імгненні зліваюцца ў хвіліны, гадзіны збіраюцца ў дні, і засталося іх няшмат…

Лёс адмераў мне часу ў абрэз, без запасу, без лішняе секунды!

— Часу хопіць, але выконвай умовы, — схапіў ён, лёс, мяне за горла. — Кінь усё, ідзі за мною, рабі толькі тое, што я загадаю.

Я — чалавек. Я з ліку звычайных, простых, нашых, рабоў. І я паверыў, пайшоў за ім, пагнаўся і… усё роўна спазніўся. Не зрабіў сваёй галоўнай справы: не адпомсціў забойцам продкаў. Аказалася, што і лёс не здольны перамагчы час. Пакуль вёў мяне па жыцці, забойцы з яго пайшлі.

І цяпер я ашуканы! Продкі пайшлі туды неадпомшчаныя, а юды пазбеглі пакарання. Я не вярнуў гісторыі праўду. Упусціў шанц, спазніўся, не паспеў. Растае, ссыхаецца, сціскаецца мая шчыгрынавая скура. Хутка канец, канец змаганню…

Не! Не канец! Губляць ужо няма чаго, і я — свабодны! Я — не раб! Я не зламаўся! Я больш не пабягу за лёсам! Пайду яму насустрач, насуперак. Рынуся ў бой на апошняй мяжы!

Ён не мае права чмурыць нам галаву! Абяцаць тое, чаго нельга здзейсніць, даваць надзею, калі яе няма.

Я буду біцца з ім да канца!

Я пераступлю мяжу! Вярну час і сілу!

Наперад!

✧✧✧